УДК 371.3:378

В. К. Мароз, дацэнт

# МЕСЦА КУРСА «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»Ў СІСТЭМЕ ВУЧЭБНЫХ ДЫСЦЫПЛІН ТЭХНІЧНАЙ ВНУ

The artikle gives substantiation of aims and tasks of the educational course «The Belarusian Language» for technical higher educational institutions of Belarus.

Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова» на 1-м курсе тэхнічных ВНУ арыентавана на паглыбленне ведаў у сферы беларускай мовы як лінгвістычнай дысцыпліны, на развіццё навыкаў самастойнага аналізу моўных з'яў, авалоданне багаццем вуснай і пісьмовай форм беларускай нацыянальнай мовы як адной з найбольш развітых славянскіх моў, якая склалася гістарычна на беларускай этнічнай тэрыторыі і мае статус дзяржаўнай мовы ў Рэспубліцы Беларусь.

Курс беларускай мовы ў тэхнічных ВНУ Рэспублікі Беларусь разглядаецца як інтэграцыйны курс прафесійнай лексікі і асноў культуры мовы і стылістыкі. Ён прадугледжвае фарміраванне ў студэнтаў навуковага погляду на моўныя з'явы і практычнае авалоданне нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Асноўныя задачы вучэбнай дысцыпліны «Беларуская мова» – фарміраванне ў студэнтаў сістэмы ведаў пра месца беларускай мовы сярод іншых моў свету, формы беларускай нацыянальнай мовы, нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы, тэрміналагічныя пласты сучаснай беларускай лексікі, стан і перспектывы развіцця беларускай мовы як дзяржаўнай у Рэспубліцы Беларусь.

Праграма курса «Беларуская мова» адлюстроўвае сучасныя навуковыя звесткі пра беларускую мову, змяшчае характарыстыку асноўных этапаў развіцця беларускай мовы, раскрывае сістэму адметных рыс беларускай мовы ў параўнанні з іншымі славянскімі мовамі, паказвае прычыны і формы развіцця з'яў інтэрферэнцыі ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму. Асаблівая ўвага нададзена асвятленню пытанняў лексікалогіі, у прыватнасці шляхоў і спосабаў узбагачэння прафесійна-тэрміналагічнай лексікі і фразеалогіі, развіцця навуковага стылю сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Не толькі на практычных занятках, але і ў межах працы гурткоў (гурток «Вытокі»; навуковы кіраўнік – дацэнт Мароз В. К.) праводзіцца аналіз ступені распрацаванасці на беларускай мове тэрмінасістэм тых галін навукі, па якіх спецыялізуюцца студэнты БДТУ. На лекцыйных і практычных занятках засвойваюцца і паглыбляюцца веды па такіх раздзелах мовазнаўства, як лексікалогія, лексікаграфія, фанетыка, арфаэпія, графіка, арфаграфія, марфеміка, словаўтварэнне, марфалогія, сінтаксіс, пунктуацыя, стылістыка, культура мовы. У працэсе вывучэння курса студэнты засвойваюць асноўныя навуковыя паняцці курса – *сучасная беларуская літаратурная мова*, *літаратурная норма*, *народна-дыялектная мова*, *нацыянальная мова*, *дзяржаўная мова*, *афіцыйная мова*, *родная мова*, *стылі мовы*, *прафесіяналізмы*, *тэрмін*, *тэрмінасістэма*, *білінгвізм*, *полілінгвізм*, *інтэрферэнцыя*, авалодваюць літаратурнымі нормамі мовы – лексіка-семантычнымі, фанетычнымі, арфаэпічнымі, акцэнталагічнымі, арфаграфічнымі, слова-ўтваральнымі, марфалагічнымі, сінтаксічнымі, пунктуацыйнымі, адрозніваюць асаблівасці марфалогіі і сінтаксісу беларускай літаратурнай мовы ў параўнанні з рускай мовай, сістэматызуюць асноўныя групы беларускай лексікі паводле паходжання (спрадвечнабеларуская і запазычаная), сферы ўжывання (агульнаўжывальная і спецыяльная), актыўнасці – пасіўнасці (неалагізмы, гістарызмы, архаізмы), аналізуюць стылістычную дыферэнцыяцыю лексіка-граматычных сродкаў беларускай мовы, прасочваюць шляхі фарміравання тэрмінасістэмы беларускай мовы.

Вялікая ўвага надаецца развіццю вуснай формы камунікацыі ў беларускай мове – узбагачэнню слоўнікавага запасу спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. *Актуалізацыя лексічных пластоў беларускай мовы, звязаных з прафесійнай і навуковай спецыялізацыяй студэнтаў тэхнічных ВНУ, несумненна паспрыяе паступоваму і няўхільнаму пашырэнню і замацаванню беларускай мовы ў сферы адукацыі, навукі, а таксама ў іншых прыярытэтных сферах беларускага грамадства.*

Практыка пашырэння на ўсе сферы грамадскага жыцця сучаснай беларускай літаратурнай мовы – дзяржаўнай мовы Рэспублікі Беларусь – прадугледжвае высокі ўзровень культуры носьбітаў нацыянальнай мовы. Культура беларускай мовы сучаснага спецыяліста з вышэйшай адукацыяй павінна быць арыентавана на авалоданне пазнавальнай, намінатыўнай, эстэтычнай і іншых функцый мовы. Неад'емны кампанент праграмы курса «Беларуская мова» для ўсіх тэхнічных спецыяльнасцей – пытанні культуры мовы (маўлення) як сістэма камунікатыўных якасцей, што забяспечваюць правільную, да-

кладную, лагічную, выразную, багатую, дарэчную і чыстую мову.

Выпрацоўка высокай культуры мовы прадугледжвае запатрабаванасць беларускай мовы ў працэсе выкладання студэнтам тэхнічных ВНУ як спецыяльных прадметаў, так і ўсяго гуманітарнага цыклу – гісторыі, філасофіі, культуралогіі, беларусазнаўства, замежных моў і інш. На занятках па беларускай мове сувязь з самым шырокім спектрам навучальных дысцыплін забяспечваецца праз такія формы працы, як пераклад і вусны пераказ спецыяльнага тэксту, дыскусія па актуальных праблемах сучаснай навукі.

Асобна неабходна падкрэсліць такі від працы ў курсе беларускай мовы, як напісанне і абмеркаванне рэфератаў шырокага тэматычнага спектра: «Беларусь на карце свету», «Беларускія народныя святы і абрады», «Славутыя беларускія асветнікі», «Дзеячы беларускай навукі», «Беларуская анамастыка» і інш. Тэмы «Ментальнасць і нацыянальны характар беларусаў», «Народная педагогіка беларусаў» засяроджваюць студэнтаў на багатым моўным матэрыяле, які ўсебакова адлюстроўвае галоўныя праблемы беларускага быцця. Істотную ролю ў сістэме практычных заняткаў маюць разнастайныя віды аналізу мастацкіх, афіцыйна-справавых, публіцыстычных, а таксама навуковых тэкстаў.

Асноваю курса «Беларуская мова» з'яўляюцца веды, набытыя ў працэсе засваення школьнай праграмы беларускай мовы. Задача вучэбнага курса ВНУ – даць веды пра сучасную беларускаую нацыянальнаую мову як развітую сістэму, якая існуе ў дзвюх формах – літаратурнай і народна-дыялектнай. Праграма вучэбнага курса «Беларуская мова» прадугледжвае ахоп усёй нарматыўнай сістэмы сучаснай беларускай літаратурнай мовы з улікам таго, што яна фарміравалася на аснове жывых беларускіх гаворак – гэта значыць, на аснове народна-дыялектнай мовы. Жывая мова народа была і застаецца асноўнай крыніцаю папаўнення, узбагачэння сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Нормы беларускай літаратурнай мовы на ўсіх узроўнях адпавядаюць ладу жывой (народна-дыялектнай) беларускай мовы. Змест практычных заняткаў па беларускай мове ахоплівае адметныя асаблівасці сучаснай беларускай мовы ў адпаведнасці з узроўнямі мовы:

– у фанетыцы сістэма галосных падпарадкоўваецца законам «акання» і «якання»; сістэма зычных – законам асіміляцыі па мяккасці, глухасці/звонкасці, аглушэнню зычных на канцы слова ды інш.;

– у марфалогіі дзейнічаюць гістарычна выпрацаваныя заканамернасці слова- і формазмянення: назоўнікі мужчынскага роду з нулявым канчаткам у родным склоне маюць канчаткі -а і -у: хлеб-а, але цукр-у, мор-а, але шторм-у, воз-а, але бег-у; дзеясловы бегчы, есці, даць – рознаспрагальныя; назоўнікі, якія з'яўляюцца назвамі маладых істот, належаць да рознаскланяльных і маюць варыянтныя канчаткі назоўнага склону адзіночнага ліку: дзіц-я, дзіц-ё, качан-я, качан-ё, ваўчан-я, ваўчан-ё ды інш.;

– беларускі сінтаксіс таксама адпавядае ўласнаму адметнаму нацыянальнаму ладу думання і гаварэння: *дзякую вам (табе), пайсці ў грыбы, накіравацца ў кнігарню па новыя выданні, пае-хаць у млын, ажаніцца з каханаю, пасяліцца за сем вёрст, хварэць на адзёр* ды інш.

Нормы літаратурнай беларускай мовы кадыфікуюцца – фіксуюцца ў слоўніках і даведніках, замацоўваюцца ў практыцы пісьмовага і вуснага ўжывання. Кадыфікацыйная норма – гэта наяўны узус літаратурнага вымаўлення, правапісу, словаўжывання, словаўтварэння і словазмянення. У праграме курса беларускай мовы вылучаецца асобная тэма «Лексікаграфія. З гісторыі беларускай лексікаграфіі», якая дае ўяўленне пра стан і перспектывы развіцця тэорыі і практыкі складання слоўнікаў у Беларусі.

Сучасная беларуская літаратурная мова (мова, «апрацаваная майстрамі слова») – гэта гісторыка-культурны феномен нацыі. Таму надзвычай важны кампанент ілюстрацыйнага матэрыялу, які выкарыстоўваецца ў тэкстах лекцый і на практычных занятках, – мова твораў вялікіх беларускіх асветнікаў, навукоўцаў, пісьменнікаў, асабліва заснавальнікаў літаратурнай формы нацыянальнай беларускай мовы Янкі Купалы і Якуба Коласа. Важным кампанентам зместу вучэбных заняткаў курса «Беларуская мова» з'яўляецца арыентацыя на духоўныя каштоўнасці беларускай нацыі, адлюстраваныя як у самой сістэме беларускай мовы, так і ў пісьмова-літаратурнай спадчыне славутых беларускіх асветнікаў, літаратараў, мовазнаўцаў, якія ў розныя гістарычныя эпохі праявілі сябе ў беларускай навуцы, мастацтве, літаратуры. Гэта замацоўвае ў свядомасці студэнтаў уяўленне пра вялікі творчы патэнцыял беларускай нацыі, скіроўвае ўвагу на беларускую нацыянальную мову як фактар інтэлектуальнага і творчага развіцця асобы. Асаблівая ўвага надаецца творчай спадчыне класікаў беларускай літаратуры. Дацэнтам В. К. Мароз падрыхтавана і прапанавана для практычнага выкарыстання на занятках па беларускай мове спецыяльная падборка з публіцыстычных і паэтычных твораў Янкі Купалы пра беларускую мову. Азнаямленне з

шырокім спектрам афарыстычных (крылатых) выразаў дапамагае засяродзіць увагу студэнтаў на мове як аснове быцця нацыянальнай супольнасці: *«Для мовы, гэтай выразецелькі душы і думак чалавека, не патрэбна ні скіпетраў, ні каронаў, як не патрэбна для сонца якога-небудзь яшчэ пазалочанага абручча, рамак. Сонца само па сабе адна аздобнасць – і золата, і брыльянт. Таксама і мова якога-небудзь народа ёсць для яго і скіпетрам, і каронай, яго нічым не апаганенай аздобнасцяй», «Дзякуй тым, хто нашу мову родную ўскрашае!», «Выракацца роднай мовы не маем права», «Бяссмертнае слова, ты, роднае слова!»*(Янка Купала); *«Маці родная, Маці-Краіна! Не усцішыцца гэтакі боль... Ты прабач, Ты прымі свайго сына, За Цябе яму ўмерці дазволь!..»* (М. Багдановіч);*«...Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі, //Там спрадвеку гучыць мая мова булатны клінок. //Тая гордая мова, якую й тады не забудзем, //Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок», «...І на іншых вяршынях суровых (Вера! Роўнасць! Свабода! Край!) //Ты струменьчык матчынай мовы, //Быццам маці, не забывай», «Піце з чыстай крыніцы, з напеваў матчыных, //Сцеражыцеся, хлопцы, частушкі таннай, //Паважайце, любіце – бацькоўскую спадчыну-- //Усё сплыве, а легенда і песні застанецца», «Ты – наш сцяг, што нікому, нікому на свеце, нікому //Не дамо абсмяяць, апаганіць, забыць ці мячом зваяваць; Мы клянёмся табе баразной сваёй першай на полі //І апошняй раллёй, на якую ўпадзём у журбе. //Мы клянёмся табе, што ніколі, //Ніколі, //Ніколі, //Так, //Ніколі не кінем, //Не кінем, //Не кінем цябе»* (Ул. Караткевіч); *«Ільняная і жытнёвая, //Сялянская, //Баравая ў казачнай красе, //Старажытнейшая, самая //Славянская, //Светлая, як травы у расе. //Вобразная, вольная, пявучая //Мова беларуская мая!»; «І ўсё мілагучна для слыху майго: //І звонкае «дзе», і густое «чаго»* (Пімен Панчанка).

Такім чынам, авалоданне праграмай курса «Беларуская мова» мае на мэце фарміраванне ў студэнтаў сістэмы перакананняў:

– сучасная беларуская літаратурная мова здольная функцыянаваць у межах нацыі як поліфункцыянальная сістэма (як мова адукацыі, навукі, культуры, справаводства, адміністрацыі);

– толькі на беларускай гістарычнай тэрыторыі беларуская мова можа адрадзіцца ў якасці паўнавартаснага сродку камунікацыі;

– нацыянальнае адраджэнне беларускага народа немагчымае без адраджэння беларускай мовы;

– грамадзянскі абавязак і патрыятычны клопат беларускай моладзі павінны быць скіраваныя на няўхільнае пашырэнне беларускай мовы ў сферы культуры і адукацыі, навукі і адміністрацыі, у сацыяльнай і побытавай сферах;

– кожны грамадзянін Беларусі павінен валодаць вуснай і пісьмовай формамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы (умець лагічна выказваць уласныя думкі, правільна і дакладна перадаваць засвоеную інфармацыю, кваліфікавана перакладаць з іншых моў на беларускую) – спрыяць развіццю пазнавальнай і камунікатыўнай функцый сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Такая сістэма перакананняў выпрацоўваецца на аснове глыбокага ўнікнення ў працэсы сучаснага жыцця. Студэнты падзяляюць думку, што беларускае грамадства падышло да ўсведамлення неабходнасці захадаў на ўмацаванне дзяржаўнага статусу беларускай нацыянальнай мовы, дзеля чаго павінны быць створаны прыярытэтныя ўмовы для яе функцыянавання і развіцця. У сітуацыі афіцыйнага руска-беларускага двухмоўя руская мова ў Рэспубліцы Беларусь ужо не можа выконваць функцыю адзінай афіцыйнай мовы і заставацца пераважнай формай камунікацыі. Для таго каб спыніць негатыўныя ўплывы экстралінгвістычных фактараў на становішча беларускай нацыянальнай мовы, неабходна ў афіцыйным ужытку настойліва і няўхільна пашыраць беларускую дзяржаўную мову на ўсе сферы грамадскага жыцця – адукацыйную, інфармацыйную, справаводчую, навуковую, культурную.

Пасля прыняцця ў 1990 г. Закона «Аб мовах у Беларускай ССР» і надання беларускай мове статуса дзяржаўнай адносіны беларусаў да роднай беларускай мовы істотна змяніліся. Станоўчыя тэндэнцыі паглыблення павагі да беларускай мовы як нацыянальнага скарбу захоўваюць устойлівы характар да сённяшняга дня. Пераканацца ў гэтым студэнты маюць магчымасць, параўнаўшы вынікі двух апошніх перапісаў: у 1989 г. 80,2% беларусаў лічылі беларускую мову роднаю, а ў 1999 г. – 85,6%.

У межах тэмы «Гістарычныя этапы развіцця беларускай мовы» пытанне пра *двухмоўе, ці білінгвізм*, разглядаецца асобна. Паралельнае ці папераменнае свабоднае карыстанне некалькімі мовамі на тэрыторыі Беларусі існавала даўно, але яго характар і састаўныя кампаненты мяняліся. У часы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага на нашых землях поруч з беларускаю моваю, якая гучала ў княскіх пакоях і на сялянскіх палетках, суіснавала мова царкоўнаславянская як мова царквы і канфесійнай літаратуры, таксама мова лацінская як мова літаратуры, навукі, адукацыі. У часы Рэчы Пас-

палітай запанавала беларуска-польскае двухмоўе. Калі беларускія землі адышлі да Расійскай імперыі, у XIX ст. склалася адметная сітуацыя: у элітных колах выкарыстоўваліся руская і польская мовы (пры тым, што беларуская інтэлігенцыя аддавала перавагу польскай мове, якая ў гэтых колах разглядалася як інструмент супраціву русіфікацыі), у адукацыйнай і адміністрацыйнай сферах панавала руская мова, а народ размаўляў па-беларуску. У памежных раёнах Беларусі існуюць зоны беларуска-латышскага, беларуска-літоўскага, беларуска-украінскага двухмоўя. Але нідзе на нашай тэрыторыі гістарычна не замацаваліся групы кампактнага рассялення небеларускага насельніцтва, што стварыла б сітуацыю іх аўтаномнай этнамоўнай адметнасці. Таму можна канстатаваць, што ў сучаснай Беларусі адсутнічаюць аб'ектыўныя фактары для пашырэння двухмоўя як у межах усёй краіны, так і ў пэўных рэгіёнах. Што ж да выкарыстання дзвюх ці некалькіх моў у некаторых сацыяльных сферах ці на індывідуальным узроўні, то тут не ўзнікае ніякіх абмежаванняў. Разам з тым лінгвістычныя даследаванні паказваюць, што ва ўмовах усеагульнага двухмоўя у выніку ўзаемадзеяння дзвюх блізкіх моўных сістэм непазбежна паніжаецца агульны ўзровень моўнай культуры грамадства.

Увага студэнтаў звяртаецца і на тое, што, паводле даных ЮНЕСКА, беларуская мова (разам з некалькімі дзесяткамі іншых сучасных моў) занесена ў разрад моў, якім пагражае знікненне. Такая пагроза беларускай мове тлумачыцца тым, што нягледзячы на адноўлены дзяржаўны статус беларуская мова застаецца функцыянальна абмежаванай сістэмаю, пераважныя сферы выкарыстання якой – мастацкая літатарура, гуманітарныя галіны навукі, часткова сфера адукацыі і культуры, асобныя колы творчай і навуковай інтэлігенцыі. Таму сучаснае беларускае грамадства шукае спосабы ўзмацнення гарантый захавання беларускай мовы, бо пакуль жыве мова, будзе жыць нацыя, будуць квітнець дзяржава: «*Айчыны паветра сілкуе мяне //І матчынай мовы акраец*» (Сяргей Законнікаў); «*Мая мова, як шчасце на вуснах //Хвалявання гарачы прыбой, //Можа быць, на чужоў засмяюся, //Усё ж заплачу з тугі на сваёй!*» (Ларыса Геніюш); *Жывы народ, пакуль жывое слова. //Крыніцаю з-пад глею і жарствы //Адродзіцца праз ваш ратунак мова –. //Адродзіцеся з роднай мовай вы!* (Мікола Пракаповіч).

Беларускі народ валодае найвялікшым духоўным скарбам – нацыянальнай мовай і за сваю шматвекавую гісторыю стварыў на ўласнай мове багатую культуру, вартую найвышэйшай ацэнкі. Асэнсаванае ўспрыняцце лекцыйнага і практычнага матэрыялу вучэбнага курса «Беларуская мова» пераконвае студэнтаў, што мова – гэта асноўны паказчык, па якім нацыя пазнае сама сябе і па якім яе ведаюць у свеце.

На кафедры беларускай мовы БДТУ ў межах навуковай дзяржбюджэтнай тэмы «тт» падрыхтаваны матэрыял для вучэбна-метадычнага комплексу «Беларуская мова». Абагульненне вопыту чытання лекцый і правядзення практычных заняткаў са студэнтамі стацыянару і завочнай формы навучання тэхнічных ВНУ Рэспублікі Беларусь плануецца падаць у такой паслядоўнасці: 1) мэта і задачы дысцыпліны, яе месца ў навучальным працэсе; 2) курс лекцый; 3) практыкум для студэнтаў дзённай формы навучання; 4) метадычныя рэкамендацыі па напісанні кантрольных работ для студэнтаў завочнай формы навучання; 5) метадычныя рэкамендацыі па напісанні рэфератаў; 6) экзаменацыйныя пытанні па беларускай мове.

**Літаратура**

1. Беларуская мова. Прафесійная лексіка: Вучэб. праграма для вышэйшых навучальных устаноў /Склад. В. П. Зяньковіч, Т. І. Скікевіч, Н. С. Шатраўка. – Мн.: РІВШ БДУ, 2001.

2. Мароз В. К. Беларуская мова. Прафесійная лексіка: Тэксты лекцый па аднайменнай дысцыпліне для студэнтаў тэхнічных спецыяльнасцей БДТУ / В. К. Мароз. – Мн.: БДТУ, 2004.

3. Міксюк Р. В. Беларуская мова. Прафесійная лексіка: Вучэбны дапаможнік для студэнтаў тэхнічных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў. – Мн.: БДТУ, 2002.